СОЮЗ ЕВРАЗИЯ

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

29 САКАВІКА 2016 г. АЎТОРАК № 57 (28167) Кошт 2400 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА



**Філасофія армянскага танца**



**Падаходны падатак за родзічаў?**

СТАР. 17



**Падарожнік па савецкіх тунэлях**

СТАР. 19

*ЦЫТАТА ДНЯ*



**Ілона ЛЯДНІЦКАЯ, начальнік галоўнага ўпраўлення рэгулявання банкаўскіх аперацый, член праўлення Нацыянальнага банка:**

*«Сітуацыя з укладамі насельніцтва стабілізуецца. Сёння назіраецца станоўчая дынаміка. За 23 сакавіцкія дні рэшткі па тэрміновых банкаўскіх укладах фізічных асоб у нацыянальнай валюце павялічыліся на Br132,3 млрд, або на 0,5%, і на 24 сакавіка склалі Br24,4 трлн. Датэрміновае скасаванне ўкладаў не мае масавага характару. У асноўным сродкі здымаюць на куплю валюты, аблігацый банкаў і Міністэрства фінансаў, набыццё нерухомасці, аўтамабіля, вядзенне бізнесу».*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 29.03.2016 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 20119,00 | ▼ |
| Еўра | 22494,00 | ▼ |
| Рас. руб. | 296,95 | ▼ |
| Укр. грыўня | 770,84 | ▼ |

ISSN 1990 - 763X

# Дзень, поўны радасці, настаў...



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

У вёсцы Дзеркаўшчына Глыбоцкага раёна любяць на Вялікдзень спраўляць «Вэсолы» — калі валачобнікі абыходзяць хаты. Пасля і старыя, і малыя пачынаюць гуляць у біткі, як, напрыклад, мясцовыя старшакласнікі Алег УСЛОЎСКІ і Андрэй БАРЫЛА.

СТАР. 3

■ З першых вуснаў

# ПРАЦА, ПАМНОЖАНАЯ НА АДКАЗНАСЦЬ



Старшыня Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі Уладзімір АНДРЭЙЧАНКА ў інтэрв'ю «Звяздзе» пра вясновую сесію і парламенцкія актуаліі

***— Уладзімір Паўлавіч, на што вы сарыентуеце дэпутатаў ва ўступным слове пры адкрыцці 4 красавіка дзявятай сесіі?***

— На актыўную, вельмі напружаную і плённую працу. Тэрмін паўнамоцтваў цяперашняга складу парламента сёлета заканчваецца, мы прыкладзём максімум намаганняў, каб сесія і ўся наша кадэнцыя завяршыліся рэзультатыўна.

***— Колькі законаў мяркуеце прыняць?***

— Клапоцімся перш за ўсё пра іх высокую якасць, адпаведнасць задачам сацыяльна-эканамічнага развіцця, бяспекі краіны і патрабаванням Прэзідэнта. У прыкладнай сесійнай тэматыцы цэнтральным пытаннем з'яўляецца абмеркаванне Праграмы дзейнасці ўрада Рэспублікі Беларусь на 2016—2020 гады. Асабліва важныя законапраекты — аб зацвярджэнні Ваеннай дактрыны, праект Кодэкса аб культуры, блокі законапраектаў па пытаннях эканамічных адносін, праваахоўнай і судовай дзейнасці, па навацыях у заканадаўстве сацыяльнай сферы, экалогіі і прыродакарыстання, а таксама міжнародныя дакументы. Змест праекта сесійнага парадку дня даволі разнастайны і актуальны.

***— Сесія пачне сваю работу на фоне такіх турбулентных міжнародных падзей, як актывізацыя ў свеце тэрарыстычных груповак і міграцыйны крызіс у Еўропе. Ці рэзаніруюць іх наступствы ў нашым беларускім заканадаўстве?***

— Рэзаніруюць і, скажу вам, самым сур'ёзным чынам. Пацвярджэнне гэтаму — новая Ваенная дактрына, дзе ўлічаны найноўшыя пагрозы, якія вымагаюць удасканалення ваеннага будаўніцтва і ўмацавання абараназдольнасці нашай краіны, адпаведная карэкціроўка некаторых законаў аб барацьбе з тэрарызмам, па пытаннях вымушанай міграцыі.

СТАР. 2

# «Пытанні ёсць, але людзі ставяцца з паразуменнем»

Карэспандэнт «Звязды» пацікавілася ў магілёўчан думкамі наконт лютаўскіх пераразлікаў за камунальныя паслугі. Ці ўсё там празрыста і зразумела?

**На мінулым тыдні магіляўчане пачалі атрымліваць квіткі за камунальныя паслугі з пераразлікам за студзень. У панядзелак на 30-м, цэнтральным, аддзяленні пошты ў Магілёве ажыятажу не назіралася, у касы стаялі па 3-4 чалавекі, большасць нават не з жыроўкамі. «Вось у пятніцу людзей было зашмат, — кажа начальнік аддзялення Ірына Мартыненка. — Мы працуем з 8 гадзін раніцы да 8 вечара, і народ усё ішоў. Прыходзілася нават нагадваць, што мы ўжо закрываемся».**

Студзеньскі шок, калі тарыфы на камуналку падскочылі на 40-70%, а ў квітках з'явіліся новыя радкі — за асвятленне пад'езда, санітарнае ўтрыманне, электразабеспячэнне ліфта і яго тэхабслугоўванне, людзі ўжо перажылі. Па загадзе Прэзідэнта быў зроблены перагляд кошту камунальных паслуг, каб выключыць факты злоўжывання службовымі асобамі і завышэння цэн на аказаныя жыллёва-камунальныя паслугі. А жыхары атрымалі адтэрміноўку па аплаце за люты — да 5 красавіка.

Лідзія Мікалаеўна адна з тых, хто заплаціў яшчэ ў пятніцу. Сведчыць, што народу на пошце было столькі, што нават камп'ютары завісалі. Але ўсе ставіліся да тэхнічных накладак з паразуменнем. Што датычыцца кошту камунальных паслуг, то ў лютаўскім квітку цэны больш прывабныя. Прызнаецца, што, калі ў студзені атрымала квітанцыю і ўбачыла там суму ў памеры 518 тысяч, вачам не паверыла. Новая ў параўнанні з той як бальзам на душу — 320 тысяч.

СТАР. 4